НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

**№ 18 (108), КАСТРЫЧНІК 2010 ГОДА**

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

# УРОКІ ДЭМАКРАТЫІ

Завершыўся збор подпісаў для вылучэння кандыдатаў ў прэзідэнты Беларусі, які стартаваў 30 верасня. Патэнцыйныя кандыдаты і чальцы ініцыятыўных групаў цэлы месяц збіралі подпісы па ўсёй краіне. Да 29 верасня ўключна яны павінны былі здаць падпісныя лісты ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі на праверку. Усяго па Беларусі было створана 155 такіх камісій. Адразу трэба звярнуць увагу на тое, што кампанія пачалася з грубых парушэнняў заканадаўства. У камісіі прадстаўнікоў дэмакратычных партый і грамадскіх аб'яднанняў не дапусцілі – былі уключаны толькі лічаныя адзінкі, ды і тыя камуністы. Рэгістрацыя кандыдатаў у адпаведнасці з каляндарным планам павінна прайсці з 14 па 23 лістапада. На пачатку "гонкі" аб сваіх прэзідэнцкіх амбіцыях заявілі аж 17 чалавек. Аднак да канца дайшлі не ўсе. Неўзабаве зняўся з дыстанцыі вядомы спарынг-партнёр Рыгоравіча ліберал-дэмакрат Сяргей Гайдукевіч, які ўдзельнічаў ва ўсіх прэзідэнцкіх кампаніях пры яго кіраванні. Відавочна, што Лукашэнку ён больш не патрэбен, кіраўнік краіны падабраў сабе яшчэ парачку запасных гульцоў, якім магчыма паставяць па аднаму працэнту. Найбольш вядомыя палітыкі – Мікола Статкевіч (сацыял-дэмакратычная партыя), дыпламат Андрэй Саннікаў, эканаміст Яраслаў Раманчук (Аб'яднаная грамадзянская партыя), Рыгор Кастусёў ( БНФ ) ужо заявілі аб тым, што іх ініцыятыўныя групы сабралі больш за сто тысяч подпісаў. Бадай, што самы нечаканы сюрпрыз выбаршчыкі атрымалі ад вядомага беларускага паэта Уладзімера Някляева, які раней палітыкай наогул не займаўся. Някляеў за кароткі тэрмін згуртаваў каля кампаніі "Гавары праўду" даволі значную колькасць платных валанцёраў. Паэт са сваімі прыхільнікамі нібыта пераадолеў 200 тысячны рубеж і на гэтым спыніў збор подпісаў. З малавядомых кандыдатаў, якія вылучаюцца ўпершыню, можна адзначыць прадпрымальнікаў – гэта мінчук Дзмітрый Вус і віцяблянін Уладзімер Правальскі.Яны таксама спадзяюцца, што іх зарэгіструюць. І нарэшце, самы малады ўдзельнік кампаніі – юрыст з Мінску Алесь Міхалевіч, яму споўнілася ўсяго 35 гадоў. Алесь Міхалевіч мае усе шансы атрымаць кандыдацкае пасведчанне, яго ініцыятыўная група добра папрацавала. Няўзброеным вокам бачна разгубленасць і адначасова ўзрастаючае нахабства бюракратычнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Сваю барацьбу за ўладу ён пачаў яшчэ сёлетняй вясною, калі па БТ сталі дэманстраваць яго бясконцыя паездкі па прадпрыемствах. Як трапна заўважылі нашы шумілінскія выбаршчыкі, "мы кожны дзень прачынаемся і лажымся з Лукашэнкам". " Бацька" даваў кухталя неразваротлівым начальнікам, дапамагаў дактарам лячыць дзяцей ад раку, запускаў заводы, вучыў вучоных іннавацыйным тэхналогіям, ратаваў пенсіянераў ад голаду. Пра апазіцыянераў ні слова, на тэлебачанне іх не пускаюць. Праўда ўсяго адзін раз кіраўнік краіны прыпомніў дэмакратаў нядобрымі словамі, аблаяў "ворагамі народа". І сапраўды, у апошні час кіраўнік РБ не сыходзіць з экрана тэлевізара. Яго прапагандысты, як тыя сектанты, заклінаюць верыць усяму, што робіць іх вялікі гуру. Абяцанкі сыплюцца з усіх бакоў, галоўны банкір Пятро Пракаповіч заклікае несці грошы ў дзяржаўны банк, гарантуе стабільнасць курсу рубля і пры гэтым хваліцца, што запас золата і каштоўных камянёў у сховішчах увесь час павялічваецца. Між іншым, у сталіцы людзі больш купілі валюты, чым здалі. Без сумневу, улада напалохана растучай актыўнасцю грамадства. Першым не вытрымаў Лукашэнка, калі даў загад свайму кішэннаму парламенту прызначыць выбары на восем месяцаў раней вызначанага тэрміну. Усе дэпутаты палаткі аднагалосна прагаласавалі за "выбары". Мабыць спяшаецца правадыр, калі так сутаргава чапляецца за ўладу – рэсурсы скончыліся. У нашым раёне збіралі подпісы ініцыятыўныя групы Някляева і Міхалевіча. Па меркаваннях актывістаў можна зрабіць выснову, што большасці выбаршчыкам у нашым раёне Лукашэнка парадкам надакучыў. Людзі стаміліся ад мітусні, ад гістэрыі начальнікаў на пасяджэннях, ад пустых абяцанкаў. Асабліва раздражняе нашых выбаршчыкаў татальная хлусня чыноўнікаў на усіх узроўнях улады. Канешне, ўладныя ідэолагі ўсё ж такі зрабілі сваю чорную справу па запалохванню электарату. Магу сказаць, што за Алеся Міхалевіча спачатку хацелі падпісацца людзі, але затым проста, без усялякіх хітрыкаў заявілі: "Нас папярэдзілі, што будуць непрыемнасці на рабоце, а то і наогул выганяць. Куды ўладкавацца на працу ў маленькім мястэчку?". І ўсе ж нягледзячы на неспрыяльную сітуацыю, штучна створаную ўладу трымаючымі, наш народ усё больш пачынае ўсведамляць, што перамены да лепшага залежаць толькі ад іх саміх. І што кожны наш шумілінскі выбаршчык павінен хадзіць на выбары не "за каўбасой", а за пашырэннем паўнамоцтваў, правоў і свабод свядомага грамадзяніна.

**Аляксандр Шчамлёў.**

# БІБЛІЯТЭКА НА ПРОДАЖ

У Віцебску за 700 мільёнаў рублёў з аўкцыёну прададзены былы будынак Віцебскай абласной дзіцячай бібліятэкі імя Н. К. Крупскай.

Двухпавярховы цагляны будынак па адрасе вул. Леніна, д. 48а плошчай 484 квадратных метры быў выстаўлены на продаж уласнікам Дзяржаўнай установы «Віцебская абласная бібліятэка імя Леніна» 14 кастрычніка. Пачатковы кошт складаў 215 793 587 рублёў.

У выніку гандлю будынак, разам з правам арэнды ўчастку на 50 гадоў, быў прададзены за 700 мільёнаў рублёў без якіх-небудзь умоў. Гэта значыць:новы ўладальнік мае права выкарыстоўваць яго цалкам па сваім меркаванні.

Віцебская абласная дзіцячая бібліятэка імя Крупскай была арганізаваная ў 1960 годзе на базе гарадской бібліятэкі, якая таксама насіла імя жонкі Леніна.

**Т. Гаражанка.**




# "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале http://kamunikat.org/, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamunikat.org/svitanak.html , што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

# ВЫЯЗНАЯ ПРЫЁМНАЯ

Сельскія Саветы, несумненна, з'яўляюцца тым цэнтрам улады на вёсцы, куды грамадзяне ідуць і ў радасці, і ў бядзе, бо тут разглядаецца вялікае кола пытанняў, якія турбуюць людзей. Часцей за ўсё вяскоўцаў хвалюе добраўпарадкаванне вуліц і праездаў, няспраўнасць або адсутнасць водаправодаў, асвятленне населенных пунктаў. Усе яны павінны знаходзіцца ў полі зроку мясцовай улады, аднак іх вырашэнне патрабуе не толькі значных фінансавых рэсурсаў, але і сумленнага падыходу да спраў. А калі старшыня сельсавета і кіраўнік мясцовай гаспадаркі працуюць у тандэме, калі ў іх ёсць паразуменне, тады і ўзаемадзеянне, тады і ў сельсавеце можна навесці парадак. Аб'яднаўшы намаганні, яны могуць зрабіць удвая больш, вырашыць многія пытанні. Аднак нягледзячы на пэўныя паўнамоцтвы, умацаванне матэрыяльна тэхнічнай базы , нізавых бюджэтаў, паступовага вызвалення пярвічных органаў улады ад неўласцівых ім гаспадарчых функцый, эфектыўнага вырашэння праблем на месцах па-ранейшаму няма. Сельвыканкамы лічацца самым слабым звяном у сістэме ўладнай "вертыкалі". Найбольшую колькасць скаргаў і нараканняў ад насельніцтва выклікаюць недахопы ў працы пярвічнага ўзроўню ўлады. Таму раённыя ўлады вымушаны самі займацца цэлым комплексам і асабістых пытанняў грамадзян на месцах, і камунальнымі праблемамі, і гаспадарчымі, і грамадскімі. Менавіта аб гэтым ішла гаворка 19 кастрычніка на сустрэчы выязной групы Шумілінскага райвыканкама з насельніцтвам, якое пражывае на тэрыторыі Обальскага сельсавета. Пяць рэйдавых груп з прадстаўнікоў раённых і сацыяльных службаў аб'ехалі некалькі аддаленых вёсак. У кожным населенным пункце было пра што пагаварыць уладзе і мясцовым жыхарам. Як аказалася, вяскоўцам многа і не трэба. Да прыкладу, жыхары вёскі Пусташы прасілі раённае начальства павесіць усяго адзін ліхтар на перакрыжаванні, зрабіць падсыпку дарогі да могілак. Гэтаксама і ў вёсцы Соіна пенсіянеры непакоіліся пра тое, як трапіць на могілкі. Механізатары тут вялі палявыя работы і перааралі дарогу. Крый божа, хто памрэ, на чым тады завезці нябожчыка па глыбокіх і размытых асеннім дажджом разорах? Усе астатнія рэаліі жыцця пенсіянераў задавальняюць. Аўталаўка прывозіць прадукты, пенсію прыносяць рэгулярна, да таго ж яшчэ і крыху дабавілі. Цвёрдым палівам на зіму ўсе забяспечаны. У Клётчыне яшчэ летам калгасныя пастухі не дагледзелі статак кароў – у выніку жывёла патаптала прыватныя агароды, перакуліла помнікі на могілках. Ніхто не заступіўся за людзей, а самі яны не ведаюць, да каго звяртацца за кампенсацыяй. Нядаўна прызначаны старшыня Обальскага сельвыканкама М. А. Будневіч падказаў, што гэту шкоду павінен кампенсаваць калгас. Аднак дагэтуль ў калгасе ніякіх мер не прынялі, на гэтым справа і скончылася. Жыхары Шыліна скардзіліся намесніку начальніка РАУС А. М. Каралёвуна двух мужчын, якія злоўжываць спіртовымі напоямі і перашкадажаюць спакойна жыць людзям. У Падорах прыватным гаспадыням ставяць нізкую тлустасць малака, а ў Лявонаве адной жанчыне не адрамантавалі хату. Дом належыць калгасу, на рамонт няма сродкаў. Прапанавалі кватэру, але сям'я А. І. Шэдзько пераходзіць туды не спяшаецца – каля дома агарод і сад. Але заява паступіла на адрас райвыканкама, а гэта азначае, што нейкае рашэнне павінна быць прынята. На жаль, такія непрыемныя сітуацыі ўзнікаюць з-за таго, што не даведзена да канца перадача аб'ектаў у "прафесійныя рукі", якія раней знаходзіліся на балансе калгасаў, або наогул не мелі балансаўтрымальніка. На баланс спецыялізаваных арганізацый яшчэ перадаюць і дарогі, і водаправодныя сеткі, і калодзежы, і могілкі. Зразумела,што апынуўшыся ў больш кампетэнтных службах, камунальныя аб'екты атрымаюць іншы ўзровень абслугоўвання. Адпаведна і колькасць скаргаў ад насельніцтва будзе менш. А з цягам часу не будуць і групы чыноўнікаў рабіць рэйды за рэйдам па дробным бытавым пытанням на дарагіх легкавых ды паліць бензін за кошт падаткапацельшчыкаў.

**Алесь Шумскі.**

# АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя « Світанка » змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатныхюрыстаў.Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам***

# ЗБЫВАЮЦЦА МАРЫ АЎТААМАТАРАЎ

Некалі за савецкім часам у Шуміліне была станцыя тэхнічнага абслугоўвання ( СТА ), у якой рамантавалі грузавыя і легкавыя аўтамабілі. Але дваццаць гадоў таму яе закрылі, а грузавікі пачалі рамантаваць у Віцебску або Полацку. Прыватныя легкавікі і зараз людзі абслугоўваюць там, дзе прыйдзецца – у прыбудовах, гаражах, а то і на асабістых падворках. Але што рабіць, калі патрабуецца капітальны рамонт рухавіка? Да таго ж зараз колькасць легкавікоў пастаянна павялічваецца: у нашым раёне ўжо каля трох тысяч уладальнікаў асабістага транспарту. А гэта азначае, што наспеў час для адкрыцця ў райцэнтры станцыі тэхнічнага абслугоўвання . І вось нарэшце ў райвыканкаме вырашылі выдзеліць на закупку абсталявання (механічныя пад'ёмнікі, рэгуліровачныя стэнды і інш. ) каля пяцідзесяці мільёнаў рублёў. Рыхтуецца неабходная дакументацыя, ужо выдзелілі ўчастак і гаражы, якімі не карыстаюцца работнікі аддзела культуры. Запланавана адкрыццё тэхнічнай станцыі і ў горпасёлку Обаль. Разлічваюць уладкаваць на працу пяцьшэсць рабочых. На новых СТА спецыялісты пакуль што будуць абслугоўваць толькі легкавікі ( развал колаў, замена масла, рамонт рухавікоў ). На будучае плануюць адкрыццё станцыі для тэхнічнага абслугоўвання і грузавых машын.

**Я. Вайтовіч.**

# Здабыткі “Крыніцы” – адзіныя у раёне

Бульбу беларусы нездарма называюць другім хлебам. Бясспрэчна, калгасна-саўгасная сістэма ніяк не садзейнічала развіццю галіны бульбаводства на сучасным узроўні. Мяркуйце самі: сёлета ў прыватным сектары вырасцілі каля 90 адсоткаў бульбы, а ў дзяржаўным усяго дзесяць. Ды і тыя няшчасныя дзесяць адсоткаў калгасы так не змаглі ўбраць сваімі сіламі – па савецкай завядзёнцы на выратаванне калгасных палеткаў адправілі студэнтаў і школьнікаў. Толькі пасеялі сёлета ў нашым раёне гэтых карняплодаў нямнога, адпаведна і ўраджай атрымалі сціплы. Напрыклад, у “Райагр措сервісе” ураджайнасць бульбы саставіла ўсяго 50 цэнтнераў з аднаго гектара. А калі што і накапалі, тады ўзнікаюць новыя праблемы: дзе і як захаваць карняплоды? Старыя бульбасховішчы прыйшлі ў заняпад, а ў буртах захоўваць нявыгадна: па першае, вялікія страты – шмат бульбы гніе, па другое, патрабуецца многа людзей, таму што павялічваецца доля ручной працы. На будаўніцтва новых сучасных бульбасховішчаў, рэканструкцыю і мадэрнізацыю старых бракуе сродкаў. Сялянска-фермерскай гаспадарцы “Крыніца”, што ў Мішкавічах, пашанцавала – гэта адзіная гаспадарка ў Шумілінскім раёне, якая ўключана ў рэспубліканскую праграму развіцця бульбаводства на 2006 – 2010 гады. У СФГ “Крыніца два бульбасховішчы, якія даюць магчымасць у поўным аб'ёме захаваць бульбу да вясны і адпаведна зарабіць дадатковы прыбытак. У гаспадарцы сёлета накапалі тры тысячы тон бульбы пры сярэдняй ураджайнасці 200 цэнтнераў з гектара. Апроч таго, некаторыя гатункі “дэльфін” і “скарб” далі па 320 і 340 цэнтнераў з гектара. Пры гэтым рэнтабельнасць дасягнула 43,8 адсоткаў. Тэхналагічны працэс вырошчвання бульбы (пасадка, уборка) амаль поўнасцю механізаваны, рабочыя рукі спатрэбіліся толькі пры пераборцы ў бульбасховішчы. Руплівая праца мішкавіцкіх бульбаводаў дала свой плён: пяцьсот тон прадалі насельніцтву за наяўны разлік, паўтары тысячы пайшло на сбыт арганізацыям і прадпрыемствам Віцебска і Полацка. Былі нават заказчыкі і з Расійскай Федэрацыі. На наступны год бульбы ў сельгаспрадпрыемстве пасадзяць не менш за 200 гектараў, будуць закладзены і пітомнікі для новых сартоў. Спецыялісты гаспадаркі “Крыніца” падлічылі, што пры ўраджайнасці 250 цэнтнераў можна атрымаць прыбытак да 450 долараў з гектара.

**А. Прылуцкі.**

# Лепшая маці-гераіня на Шуміліншчыне

У розных краінах свету Дзень Маці адзначаюць у розны час. У Беларусі ён не выпадкова супадае з вялікай праваслаўнай урачыстасцю – Пакровамі, таму што мае глыбокія рэлігійныя карані. Існуе паданне, што ў 910 годзе ў Іерусаліме адбылася цудоўная з'ява. Падчас Богаслужэння людзі заўважылі, што Маці Божая як бы абараняючы тых, хто маліўся, накрыла іх шырокім белым покрывам. Гэта ўсіх уразіла, а дзень 14 кастрычніка застаўся для вернікам вялікім святам. І сёння хрысціяне памятаюць пра нябесную заступніцу, ушаноўваюць яе, стараюцца жыць з добрым сэрцам і чыстай душой. Цяпер у нашай краіне ў пятнаццаты раз адзначаюць свята маці, і людзі віншуюць сваіх матуль. 14 кастрычніка афіцыйныя ўрачыстасці з гэтай нагоды адзначалі ў Шуміліне. У нашым раёне стала традыцыйнай з'явай ладзіць мацярынскі злёт. Прыгожых, святочна ўбраных жанчын сустракалі віншаваннямі і кветкамі ў Доме культуры. Да матуль раёна звярнуўся з прамовай старшыня райвыканкама В. А. Падляшчук, які адзначыў паважаную і сацыяльна значную ролю жанчыны ў грамадстве. Вальдэмар Антонавіч выказаў асаблівую падзяку мнагадзетным матулям – шматдзетнасць вымагае няспыннай працы, жанчынам, якія ўзялі на выхаванне прыёмных дзяцей-сірот. Пры гэтым кіраўнік раёна абяцаў і надалей аказваць падтрымку сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Напярэдадні святочнага дня вылучылі адну з лепшых маці нашага раёна на ўзнагароджванне прэміяй імя Героя Сацыялістычнай Працы С. Т. Пальвінскай. На гэты раз выбралі маці двух дачок, дырэктарку Добрынскай школы Ніну Бегунову. Настаўніца і маці сваім станоўчым прыкладам вучыць дзяцей дабрыні, адказнасці за свае ўчынкі, маральнай стойкасці: дзіця можа не стаць знакамітым і багатым, але Чалавекам – абавязкова. Разам з тым важна, каб дзіця прымалі такім, якое яно ёсць, улічвалі іх жаданні і патрэбы, а затым ужо патрабавалі ад яго большых дасягненняў, чым удалося іх бацькам. Не сакрэт, што нярэдка шмат дзяцей ёсць у тых сем'ях, дзе бацькі п'юць, і дзеці нараджаюцца, так бы мовіць, спантанна. У добрых сем'ях плануюць бюджэт і ўвогуле будучае, і пакуль маюць аднаго, максімум двух дзяцей. Таму тут і выхаванне, і адукацыя малых каштуе шмат. Так што гэтыя сем'і, таксама як і шматдзетныя, маюць патрэбу ў матэрыяльнай падтрымцы. А калі бацькі цэлы дзень прападаюць на працы, каб больш зарабляць, хто падлічыць колькі увагі і пяшчоты недадалі яны сваім дзецям? Зрэшты, у гэты святочны дзень маладым сем'ям аказалі маральную падтрымку. Старшыня раённага савета дэпутатаў Ірына Новікава ўручыла пераможцам конкурсу “За узорны парадак на сядзібах” дыпломы, кветкі і сувеніры. На заканчэнне мерапрыемства гасцей павесялілі самадзейныя артысты Шумілінскага ГДК. Трэба сказаць, што свята паволі прыжываецца, але хочацца, каб яно сталася не толькі афіцыйным, але і сямейным. Часам здаецца, што акрамя афіцыёзу ў нашым складаным жыцці больш нічога не адбываецца. Людзі рэдка збіраюцца самі, па ўласнай ініцыятыве, без загадаў начальства. Найчасцей для многіх свята з'яўляецца падставай для банальнай п'янкі. Як бы там ні было, але 14 кастрычніка нагадвае ўсім: не забывайце сваіх матуль, яны любяць нас як Маці Божая і жадаюць нам шчасця.

**С. Горкі.**

# Доўгабуд у Башнях паскораць суботнікі

Жывёлагадоўчы комплекс, які распачалі будаваць у калгасе “Баравінка”, пераэывае не лепшыя часы. Першую чаргу буйной малочна-таварнай фермы ўзводзілі амаль тры гады. Зараз там знаходзіцца 400 кароў, якія нядаўна прайшлі адаптацыю ў новым памяшканні з сучасным абсталяваннем. Асноўныя работы вядуца генеральным падрадчыкам УП “СаюзІнвестБуд”. Але як і заўжды, у нашым раёне вечна не хапае падсобных рабочых. На аб'екце накапілася столькі будаўнічага смецця, што ніводная арганізацыя не бярэцца за яго ўборку. Тады на дапамогу прафесійным будаўнікам пасылаюць звычайных людзей з розных прадпрыемстваў і арганізацый Шумілінчшыны. Кіраўніцтва раёна ледзь не кожны тыдзень адпраўляе ў вёску Башні “добраахвотных памочнікаў”. Шумілінцы ў калгасе ніколі лішнімі не бываюць – ім там заўсёды рады, як вясковыя калгаснікі, так і будаўнікі з горада. Кіраўніцтва калгаса “Баравінка” упэўнена, што да зімы другая лінія “малочнай фабрыкі” будзе здадзена, да чатырох соцен кароў далучаць яшчэ 400. Увогуле неблагі размах для маленькай вёскі, можа цяпер некалькі маладых спецыялістаў не збегуць у горад.

**С. Горкі.**

## НЕЦВЯРОЗЫ ВАДЗІЦЕЛЬ – ПАТЭНЦЫЙНЫ ЗЛАЧЫНЦА

Другі раз запар папаўся п'яны за рулём жыхар аграгарадка Светласельскі. Раней ён быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, але зараз супраць аматара зялёнага змея ўзбуджана крымінальная справа.

# Дзе знайсці адзін мільярд для мастакоў?

На чатыры гады расцягнуўся рамонт будынка старой сярэдняй школы, што размешчаны на перакрыжаванні вуліц Ленінскай і Піянерскай . У былую адукацыйную ўстанову раённыя ўлады вырашылі перасяліць школу мастацтваў. Паводле начальніка аддзела культуры Алега Мацвяйчука, напрыканцы мінулага года на рэканструкцыю будынка асвоілі 980 мільёнаў рублёў. Аднак усё роўна грошай не хапіла – з вобласці “выбілі” дадаткова 325 мільёнаў. Па усяму відаць, што аб'ект пад ключ не здадуць і ў гэтым годзе, будаўніцтва спыніцца на кансервацыю. Насамрэч фінансавай дапамогі з вобласці і на гэты раз аказалася недастаткова для таго, каб перавесці ў будынак усю школу мастацтваў. Таму пакуль што на другім паверсе справіць наваселле музычная школа. Тым больш, што там замянілі дах, зрабілі ўнутранае аздабленне і упрыгожанне. У пачатку лістапада падрадчык абяцаў устанавіць дзверы і навесіць столь, а каб правесці электрыку патрабуецца адзін-два дні. Дзе кіраўнікі раёна будуць шукаць яшчэ адзін мільярд рублёў на поўную рэканструкцыю аб'екта, невядома. Затое вядома, што мастацтва патрабуе ахвяраванняў, і немалых. Але шумілінцы не губляюць надзеі і спадзяюцца, што ў бліжэйшы час таленавітыя дзеці змогуць парадаваць аматараў музыкі сваімі поспехамі ў аднаўленай школе.

**Алесь Прыбярэжны.**

## ЗДАРЭНІ. КРЫМІНАЛ

# ЗАСТАЛІСЯ ТОЛЬКІ СЦЕНЫ

У дыспетчарскую райаддзела па надзвычайных сітуацыях пазванілі з вёскі Беркавічы – загарэлася лазня. Калі шумілінскія пажарнікі даехалі да вёскі, агонь ужо ахапіў усю пабудову. Пажар загасілі, але ад лазні засталіся толькі ўшчэнт абгарэлыя сцены. Прычыны ўзгарання высвятляюцца.

# СУТЫКНЕННЕ

Грузавы аўтамабіль, якім кіраваў вадзіцель з Віцебска, ехаў на Полацк. Вадзіцель з упраўленнем не справіўся і выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе і сутыкнуўся з легкавіком “Вольксваген”, за рулём якога сядзеў жыхар Полацка. На шчасце, вадзіцелі не пацярпелі, аднак абедзве машыны значна пашкоджаны. Складзены адміністрацыйны пратакол на парушальніка, які стварыў перашкоды на сустрэчнай паласе. Цяпер яму пагражае буйны штраф, або пазбаўленне правоў на два гады.

# ПАНАЖОЎШЧЫНА

У Шумілінскі РАУС паступіла паведамленне з раённай бальніцы: дастаўлены мужчына з нажавым раненнем. Як устанавілі супрацоўнікі унутраных спраў, раненне малады мужчына атрымаў ад сужыцеля сваёй маці ў ходзе бытавой сваркі. Хулігана затрымалі, ён змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. Узбуджана крымінальная справа, вядзецца следства.

# “Я КАТЭГАРЫЧНА АДМАЎЛЯЮ ІДЭЮ, ШТО ЛЮБЫ ПАСЛЯ ЛУКАШЭНКІ БУДЗЕ ЛЕПШ”

***Лідэр руху «За свабоду» Аляксандр Мілінкевіч расказаў, чаму не павёў людзей на штурм у дзень выбараў 2006 года, якой павінна быць Плошча зараз і чаму ён адмовіўся ісці кандыдатам.***

Пасля інтэрв'ю Аляксандр Мілінкевіч прызнаўся мне, што кепска спіць начамі, бо думае пра тое, як будуць развівацца падзеі на Плошчы пасля 19 снежня. Рызыкну сцвярджаць, што не так шмат у беларускай палітыцы людзей, якія жывуць не толькі сённяшнім днём і не толькі сваімі інтарэсамі. Мілінкевіч – стратэг, стаер, і, магчыма, таму ён вылучаецца на фоне многіх беларускіх палітыкаў, што практыкуюць выключна бег на кароткія дыстанцыі.



**«У жорстка аўтарытарнай краіне зрабіць каляровую рэвалюцыю немагчыма»**

**Цыганкоў:** Нярэдка вам (дарэчы ці не вельмі) узгадваюць падзеі выбараў 2006 году. І канкрэтна дзень галасавання 19 сакавіка, і пазней, падчас Плошчы.. Пытаюцца, чаму вы 19 сакавіка не павялі людзей на нейкія больш рашучыя дзеянні. Увогуле, ці быў тады нейкі план, што рабіць з тымі людзьмі, якія прыйдуць на Кастрычніцкую плошчу, ці ўсё вырашалася даволі спантанна?

**Мілінкевіч:** Перш за ўсё – я цвёрды прыхільнік мірных акцыяў. І тады і сёння я лічу, што калі па віне палітыкаў праліваецца кроў і гінуць людзі – гэта велізарная трагедыя. Я вернік і для мяне жыццё чалавека не мае цаны.

Другое. Якую мэту мы тады ставілі? На ўсіх сходах падчас кампаніі я заклікаў людзей на плошчу, каб пратэставаць супраць недэмакратычных выбараў, супраць таго, што воля людзей не ўлічваецца. Але пытанне, ці варта людзей у такім выпадку весці на нейкі штурм. Давайце задумаемся, чаго мы тады маглі дамагчыся штурмам? Мы выдатна ведалі, што не набралі 50 працэнтаў нават разам з Казуліным. І каб ісці на штурм прэзідэнцкага палаца.. для гэтага трэба быць перакананым, што ты выйграў выбары. Тады ты патрабуеш вызваліць гэтае месца. Дарэчы і вядомыя каляровыя рэвалюцыі адбываліся пасля таго, як апазіцыя атрымлівала электаральную перамогу.

Па-другое, колькасць людзей для такіх акцыяў павінна быць яўна большая. Хаця я ганаруся, што на Плошчу выйшла больш за 30 тысяч Грамадзянаў. Калі ацэньваць тыя падзеі, то і сёння я зрабіў бы тое самае – не павёў бы людзей на штурм. Мы ж змагаемся не толькі за ўладу, але і за сэрцы людзей. А людзі расцанілі б такія дзеянні як радыкалізм, як змаганне выключна за тое, каб выкінуць з крэсла аднаго і сесці самім. Плошча павінна мець падтрымку большасці грамадства. І тое, што мы запрапанавалі людзям пасля першага вечара пратэсту вярнуцца назаўтра ізноў са сваімі сябрамі, з новымі сіламі — не лічу памылкай. Намёты ў першы дзень паставіць не ўдалося, абсалютная большасць не вытрымала б шматгадзіннага начнога стаяння.

Увогуле сёння я цалкам перакананы, што ў краіне, жорстка аўтарытарнай як наша, у краіне, дзе ў грамадстве пануе страх, зрабіць каляровую рэвалюцыю немагчыма. Бо Сербія, Украіна, Грузія – гэта не былі дыктатуры, гэта былі кепскія дэмакратыі. Ва Украіне, калі выходзілі на Майдан – там ніхто не баяўся, там міліцыя іх апякала, кіеўскія ўлады дапамагалі ім гукаўзмацненне паставіць.

Я скажу і пра Плошчу, якая можа быць на гэтых выбарах. Нельга дапусціць, каб яна была радыкальнай. Калі пральецца кроў, калі будуць ахвяры – тады, я думаю, большасць грамадства згубіць веру ў нацыянальна-дэмакратычныя сілы, у тых, хто выйдзе на Плошчу пад бел-чырвона-белымі сцягамі. І на выбарах, якія будуць пасля Лукашэнкі, мы будзем мець значна менш шанцаў.

**Цыганкоў:** Пасля выбараў 2006 году вас пачалі, што называецца, «мачыць», пры гэтым, пераважна свае. Спачатку вас пазбавілі «звання» лідэра дэмакратычных сілаў, потым з'явіліся артыкулы кшталту «Отбеливатель», дзе вас абвінавачвалі, што вы гуляеце на ўладу. Ці вы зараз можаце сказаць, хто стаяў за гэтай кампаніяй і для чаго яны была разгорнутая?

**Мілінкевіч:** Вядома, у палітыцы ёсць натуральная канкурэнцыя. Увогуле гэта нармальная з'ява, але канкурэнцыя бруднымі метадамі – гэта амаральна і разбуральна. Мой рэтынг сёння 12 працэнтаў, значна меншы, чым у час выбараў, але ў тых апазіцыянераў, што займаліся чорным піярам, ён увогуле на ўзроўні статыстычнай памылкі. Мы ўсе прайгралі. Пасля 2006 года беларуская апазіцыя зрабіла гістарычную памылку. У 2006 годзе быў вобраз моцнай, аб'яднанай апазіцыі, і гэта вельмі добра ўздзейнічала на наша грамадства і на нашых замежных партнёраў. Гэта была інвестыцыя не персанальна ў Мілінкевіча, а ў беларускую дэмакратыю. Калі на Кангрэсе праз год вырашылі, што ўжо адзіны лідэр не патрэбны, — гэта была памылка. Не бывае ідэальных лідэраў, гэта мог быць і не я, мог быць іншы чалавек.

Ну а потым, вядома, ёсць сілы, якія працуюць супраць нашай інтэграцыі ў Еўропу. І для іх я ў пэўным сэнсе ўвасабляю праеўрапейскую арыентацыю. Адтуль і ўся гэта спроба дыскрэдытацыі.

**«Для мяне не мае сэнсу ісці васемнаццатым кандыдатам»**

**Цыганкоў:** Мяркую, усё ж самае галоўнае пытанне нашага інтэрв'ю, прынамсі, для мяне – чаму вы адмовіліся удзельнічаць у гэтых выбарах? Апошнія сацыялагічныя апытанні паказалі, што ў вас самы вялікі рэйтынг – 12 працэнтаў. Інфармацыйная вайна расейскіх СМІ нараджае пэўнае натхненне ў апазіцыйных палітыкаў. Расце еўрапейская арыентацыя беларусаў. Усе гэтыя фактары ці не прымушаюць вас шкадаваць пра сваё рашэнне?

**Мілінкевіч:** Я не пайшоў на выбары не ад таго, што я ў адчаі ці збіраюся сыходзіць з палітыкі. На гэтых выбарах, якія Лукашэнка робіць чыста тэхнічнымі, ён проста сам сябе прызначыць. Дамагчыся электаральнай перамогі зараз немагчыма.

Таму я стаўлю сабе стратэгію больш доўгатэрміновую, бо гэтымі выбарамі толькі пачынаецца сапраўдная барацьба за Беларусь. Я спадзяюся, што ў найбліжэйшыя гады шмат у чым вырашыцца цывілізацыйны лёс Беларусі. Я рыхтуюся да першых дэмакратычных выбараў пасля Лукашэнкі. Там трэба будзе перамагаць, і гэта будзе самае галоўнае змаганне.

**Цыганкоў:** Значыць, вы адразу ставіце крыж на гэтай кампаніі, што ідзе цяпер? Кандыдаты працуюць, тысячы людзей збіраюць подпісы, а вы ім кажаце, што нічога не будзе?

**Мілінкевіч:** Гэта вельмі важна, што людзі ўдзельнічаюць у выбарах. Я і сёння быў на пікеце, і заўтра, я свой палітычны патэнцыял выкарыстоўваю ў гэтай кампаніі. Адзінае, я лічу, што для мяне не мае сэнсу ісці 18-м кандыдатам і змагацца са сваімі партнёрамі па апазіцыі, хто набярэ больш працэнтаў: тры ці паўтара. Для маёй стратэгіі сённяшні працэнт Ярмошынай не важны. Хай з'яўляюцца новыя твары ў беларускай палітыцы, гэта карысна. Але – немагчыма перамагчы ў выбарах, якіх няма, дзе не падлічваюцца галасы.

**Цыганкоў:** Але ж вы рыхтаваліся ісці на выбары. У лістападзе 2009 вы правялі Еўрапейскі форум, потым была створана кааліцыя Беларускі Незалежніцкі блок, — на думку многіх, «пад вас». Потым у гатэлі «Еўропа» вы аб'яўляеце пра свой намер ісці на прэзідэнцкія выбары. І раптам – такое рашэнне. Чаму б вам не сказаць шчыра, што вас падвялі партнёры па Блоку, тая ж Беларуская Хрысціянская дэмакратыя, якія вырашылі, што будуць працаваць не на вас, а на свайго кандыдата Рымашэўскага?

**Мілінкевіч:** Адна з прычын майго няўдзелу – сапраўды, у тым, што мне не ўдалося аб'яднаць усе палітычныя сілы, што стаяць на пазіцыях свабоды, незалежнасці, беларускага адраджэння, еўрапейскага шляху развіцця. Гісторыя зробіць свой вырак, хто ў гэтым вінаваты, але быў страчаны велізарны шанец, каб ужо на гэтых выбарах прадэманстраваць, што беларуская нацыянальная дэмакратыя можа працаваць разам, што яе лідэры – адказныя палітыкі. Я веру, што гэтыя выбары стануць пэўным урокам для многіх дэмакратаў.

Мае выбаршчыкі – гэта людзі дэмакратычныя, яны памяркоўныя і любяць Беларусь, разумеюць, што важна мірным шляхам прайсці праз выпрабаванні, што нас чакаюць. Вобраз Мілінкевіча – гэта чалавек, які хоча справядлівасці і свабоды, які выступае за беларускае адраджэнне і еўрапейскую будучыню. Але ён не будзе махаць шашкамі, гэта чалавек, які выступае за эвалюцыю. Той, хто будзе бліжэй да гэтых каштоўнасцей, за таго і прагаласуе «мой» электарат.

**«Ісці ў Еўропу праз Маскву немагчыма»**

**Цыганкоў:** Вы казалі, што сёння ў беларускай апазіцыі сфармаваліся два блокі з рознай геапалітычнай арыентацыяй. Але ці вы сапраўды лічыце, што, напрыклад, Саннікава, Някляева ці Раманчука можна назваць прарасейскімі кандыдатамі?

**Мілінкевіч:** Я не аматар развешваць ярлыкі. Але лічу, што нават адзін лозунг можа прадэманстраваць шмат чаго. Напрыклад, Уладзімер Някляеў кажа, што ён за інтэграцыю з Расіяй і за партнёрства з Еўропай. Я кажу, што я за партнёрства з Расіяй і за інтэграцыю з Еўропай. Гэта велізарная розніца, гэта выбар шляху развіцця. Пасля інтэграцыі з Расіяй шанец на еўраінтэграцыю, на жыццё па еўрапейскіх стандартах, робіцца для нас недасягальна далёкім. Вяртацца ў еўрапейскую сям'ю праз Маскву не атрымаецца.

Тое, што сёння Расія спрабуе замяніць Лукашэнку на іншага чалавека – гэта яшчэ не значыць, што мы стратэгічна можам мець аднолькавыя інтарэсы. Тактычна – можам, стратэгічна – не. У Расіі свае стратэгічныя інтарэсы, у Беларусі – свае. Расія хацела б пакінуць нас у зоне свайго дамінуючага ўплыву, яна хоча захавацца як цэнтр аб'яднання постсавецкіх рэспублік, і быць раўнапраўным канкурэнтам Еўрасаюзу. Ці трэба нам супрацьстаяць Еўрасаюзу, мы мусім быць у пэўным партнёрстве, а ў перспектыве і сябрам Еўрасаюзу. Беларускія палітыкі павінны перш за ўсё адстойваць беларускія інтарэсы.

**Цыганкоў:** Але ці лічыце вы, што вышэйназваныя мной палітыкі сапраўды прарасійскія? Можа, яны проста выкарыстоўваюць пэўныя лозунгі ў тактычных мэтах, каб атрымаць рэсурсы, з'яўленне ў прэсе? А потым, калі прыйдуць да ўлады, забудуць пра сваіх спонсараў і будуць праводзіць нармальную прабеларускую палітыку?

**Мілінкевіч:** Я не згодны з такім падыходам. Ёсць розныя мэты ў тых, хто фінансуе палітычныя кампаніі. Гэта пэўны палітычны інфантылізм, або двудушша казаць, што грошы не пахнуць. Ёсць грошы, за якія, калі не выканаеш задання, і галаву адарвуць, а нас краіны пазбавяць. Не любыя сродкі могуць пайсці для дэмакратызацыі Беларусі. Заўсёды трэба думаць: тыя людзі, што цябе падтрымліваюць – ці іх цікавіць тое самае, што і цябе? Я лічу, што тая залежнасць, у якую трапляюць людзі, якія бяруць сродкі ад актыўных гульцоў у вызначэнні беларускага лёсу, павінны задумацца, а што будзе потым. Адказная палітыка не мае права жыць толькі сённяшнім днём.

**Цыганкоў:** Цяпер часам з'яўляюцца такія меркаванні, што Лукашэнка ці не меншае зло, чым згуба суверэнітэту. Некаторыя шчырыя патрыятычныя людзі нават заклікаць аб'ядніцца вакол улады. Як вы ставіцеся да такой дылемы?

**Мілінкевіч:** Я катэгарычна адмаўляю ідэю, што любы пасля Лукашэнкі будзе лепшы за яго. Калі прыйдзе чалавек, які будзе абавязаны здаць беларускую эканоміку, прыватызаваць яе на карысць адной дзяржавы – то гэты чалавек будзе горшы за Лукашэнку.

Я цвёрды апанент існуючага рэжыму. Я хачу жыць у незалежнай краіне, у дэмакратыі і свабодзе, але я не жадаю страціць шанец на вяртанне ў еўрапейскую сям'ю. І вось тут існуе няпростая дылема. Не збіраюся аб'ядноўвацца вакол улады, але я бачу, што ёсць моманты, дзе можна супрацоўнічаць з уладай дзеля захавання незалежнасці і еўрапейскага выбару, увесь час адстойваючы нашы нацыянальныя інтарэсы.

**Цыганкоў:** Вы кажаце – «Калі прыйдзе чалавек, які будзе абавязаны здаць беларускую эканоміку, прыватызаваць яе на карысць адной дзяржавы – то гэты чалавек будзе горшы за Лукашэнку». Вы бачыце такіх людзей сярод сённяшніх кандыдатаў?

**Мілінкевіч:** Людзей, якія б жадалі гэта зрабіць, напэўна, няма. Але людзей, якія, прыйшоўшы да ўлады, будуць вымушаныя гэта рабіць, я бачу. Яны могуць паспрыяць змене ўлады праз прынцып – «чым горш, тым лепей», і могуць пазбавіцца інструментаў, каб абараніць суверэнітэт Беларусі. Калі будзе халадна і галадна, калі будзе вялікі крызіс, рашэнні аб нашым лёсе могуць прымацца не ў Беларусі.

Я нармальна стаўлюся да тых людзей, якія сёння ўдзельнічаюць у выбарах. Але проста хачу запытацца, ці ўсе яны разумеюць тую адказнасць, якую яны бяруць на сябе, калі спрабуюць змагацца выключна з дыктатурай, забываючы пра незалежнасць. Калі гэта будзе незалежнасць, якая будзе звязвацца з інтэграцыяй з Расіяй, то я не бачу перспектыў для нашага суверэнітэту. Я б вельмі хацеў, каб Расія мела тут інтарэс дэмакратыі і нашай незалежнасці. Але цяпер у яе напэўна іншыя інтарэсы на першым месцы.

**Віталь Цыганкоў,**
**«Свободные новости плюс».**

# КАК В БЕЛАРУСИ ПОДКУПАЛИ РОССИЙСКИХ ЖУРНАЛИСТОВ

**Представителей российских СМИ принимали в нашей стране по системе «Super All Inclusive».**

Как известно, Москва славится купеческим размахом при приеме гостей. Но в случае с белорусскими журналистами, приглашенными на встречу с главой президентской администрации РФ Сергеем Нарышкиным, все было скромно и корректно. Никто не пытался задобрить «акул пера», прибывших в Кремль, никто не предлагал оплатить проезд или предоставить гостиницу, никто не вручал дорогостоящие сувениры. Именно так с нашей точки зрения и должны строиться отношения между чиновниками и журналистами.

Но совсем иначе себе это представляют белорусские власти. Корреспондент «Липецкой газеты» Софья Вобликова рассказала «Белгазете», какой прием был оказан 100 российским журналистам, приехавшим в Минск на пресс-конференцию Александра Лукашенко. Вот несколько цитат:

«Прием российской прессы был организован на высшем уровне… Речь шла даже не о том, чтобы оплатить проезд, а о полном материальном обеспечении – и жильем, и питанием. Причем не только на территории Беларуси: те, кто приезжал в Москву из отдаленных регионов России, уже с утра (из Москвы мы уезжали вечером) могли приехать в белорусское посольство – там их размещали в номере и обеспечивали питанием…»

«При желании можно было не потратить вообще ни копейки. Когда я собиралась в Беларусь, то спросила у коллег из редакции, которые были в таком пресс-туре до меня: «Сколько денег брать, чтобы чувствовать себя комфортно?» И мне ответили: «Вообще можно не брать ни копейки». Когда они приехали в Беларусь и обменяли российские рубли на белорусские, то в конце поездки им пришлось всё менять обратно. Нигде в Беларуси мы ни за что не платили – ни за проезд, ни за проживание…»

«Мы останавливались в гостинице «Планета». Когда ехали, то сомневались насчет жилья, но на месте всех расселили по одному человеку. Номера, правда, были не у всех одноместные, я, например, жила в двухместном номере, но жила там одна. Номер был хороший, со всеми удобствами…»

«На предприятиях, само собой, [дарили] альбомы о производстве, еще какую-то печатную продукцию. На кондитерской фабрике – сладкие подарки, конфеты. После встречи с мэром Минска – фотоальбомы… После встречи с Лукашенко – отдельный набор подарков, в котором была и водка от президента в подарочной упаковке. Еще подарили куклу, какие-то другие сувениры… В итоге, когда мы уезжали, это все было очень тяжело везти, а бросать было жалко…»

Вобликова также рассказала, что накануне поездки коллеги предупреждали ее, что пресс-туры в Беларусь губительно сказываются на фигуре. И действительно столы ломились от яств, начиная с драников и заканчивая икрой.

В общем, представителей российских СМИ принимали в Беларуси по системе «Super All Inclusive». Как можно охарактеризовать подобные вещи? Восхищаясь гостеприимностью белорусских властей, Вобликова сама проговаривается: «Подобный подход, конечно, подкупал…»

Действительно, по существу речь идет о подкупе журналистов из соседней страны, которых приглашают в Беларусь, кормят-поят до отвала, возят по лучшим предприятиям страны, а в финале сам глава государства дает многочасовую конференцию для них. После этого абсолютное большинство участников пресс-тура, вернувшись домой, строчит восторженные статьи об Александре Лукашенко. Вот только почему этот «банкет» оплачивается из карманов белорусских налогоплательщиков?!

**Кирилл Букин.**

# ДОБРА, ШТО КАМПАНІЯЙ ЗАЙМАЮЦЦА МАЛАДЫЯ

**Настасся Шамрэй**

Моладзевы лідэр Іван Шыла цяпер навучаецца ў Польшчы, але пры гэтым ён уваходзіць у дзве ініцыятыўныя групы і крытыкуе кандыдатаў Саннікава і Някляева.

**«НН»: Каго з кандыдатаў вы падтрымліваеце і чаму?**

**ІШ:** З усіх кандыдатаў імпануе Алесь Міхалевіч. На мой погляд, у гэтай выбарчай кампаніі ён мае найбольш рэалістычную мэту, якая прадвызначае даволі адэкватную пазіцыю палітыка. Маю на ўвазе жаданне атрымаць досвед арганізацыі агульнабеларускай кампаніі, стварэння ўласнага іміджу ўплывовага палітыка і, уласна, каманды для наступных прэзідэнцкіх выбараў.

Важна агулам і для нацыянал-дэмакратычных сілаў мець сваіх кандыдатаў, удзельнічаць у выбарчай гонцы і набірацца досведу і ў той жа момант, засведчыць наяўнасць у беларускай палітыцы ў сітуацыі, калі важную ролю пачалі адыгрываць сілы, настроеныя на шлях у Еўропу праз усходнюю мяжу.

Безумоўна, падтрымліваю і Рыгора Кастусёва і разумею, наколькі важна новаму кіраўніцтву БНФ прадэманстраваць здольнасць партыі мець уласнага кандыдата. Вядома, хочацца быць ідэалістам-рамантыкам і з гэтага пункту гледжання Кастусёў ідэальны кандыдат, бо подпісы збіраюцца бясплатна.

Аднак, у той жа момант, адсутнасць рэсурсаў ёсць і мінусам кандыдата, бо толькі на грунце каштоўнасцяў наўрад ці можна мець выканальны план дзеянняў на далейшых этапах выбарчай кампаніі. Але вельмі добра, што кампаніяй займаюцца менавіта маладыя палітыкі і грамадскія дзеячы. Ідэалісты і рамантыкі вучацца выконваць складаныя задачы ў складаных умовах. Для партыі і агулам дэмакратычнага руху гэта будзе важны здабытак.

**«НН»: Вы ўваходзіце ў якую-небудзь ініцыятыўную групу?**

**ІШ:** З тых прычынаў і ўваходжу ў ініцыятыўныя групы гэтых палітыкаў. Хоць прапановы былі практычна ад усіх выпучэнцаў у кандыдаты. Але, на жаль, уваходжанне гэтае дэкларатыўнае, бо на дадзены момант атрымоўваю адукацыю ў Польшчы.

**«НН»: За каго ўжо падпісаліся і чаму менавіта за гэтых людзей? (калі ўжо былі ў Беларусі канешне пасля пачатку збору подпісаў)?**

**ІШ:** Паставіў подпіс толькі за Андрэя Саннікава, бо яговы паплечнікі арганізавалі пікет непасрэдна на чыгуначным вакзале і давялося перад адʼездам іх спаткаць.

Хоць, у прынцыпе, не падтрымліваю каардынатара Хартыі-97 з многіх прычынаў. Найперш — раптоўная змена пазіцыі, спадзевы на дэмакратызацыю праз Расею, што не было ўласціва яму яшчэ два гады таму. Дый агулам складаецца ўражанне, што Саннікаў робіць усе, каб спадабацца Расеі. Мяркую, гэтага яму не ўдасца і пасля выбараў давядзецца зноў з надзеяй глядзець у ранейшым, заходнім кірунку. Дый неяк не разумею, як можна прэтэндаваць на тытул дэмакратычнага кандыдата, калі кіруеш закрытай грамадскай структурай невядомымі метадамі 14 год, а створаны пры ёй сайт, хоць і ёсць папулярны, але далёкі ад плюралізму і абʼектыўнасці. Апраўданне такой пазіцыі наяўнасцю рэжыму — не апраўданне для мяне.

Вядома, з моцных кандыдатаў не можна абмінуць Уладзімера Някляева. Ён сапраўды мае найбольш прафесійную і масавую каманду. Але, няясная пазіцыі не выклікае даверу. Я неадназова пра гэта гаварыць і нават атрымаў у верасні адказ паэта — прыгожыя дэкларацыі і абяцанні. Пагаджуся з ацэнкай Чалага: «Чалавек можа гаварыць пра ўсё, але пры гэтым — ні пра што. Пазіцыянавання няма ніякага, наогул. Ні аднаго канкрэтнага пытання, ні аднаго пэўнага адказу, дзе б там ні было». Невядомае паходжанне грошай, татальная плата валанцёрам, абыякавасць пры рэкрутаванні — тэхнічныя моманты, якія сапраўды бянтэжаць. Палітычныя — прызнанне Абхазіі, тыя ж спадзевы на дэмакратызацыю праз Расею, магчымыя інтэграцыйныя праекты з усходнім суседам.

Іяк ні стараўся, не бачу палітыка ў паэце, на жаль. Менавіта такое меркаванне склалася ўлетку пасля сустрэчы з маладафронтаўцамі. І такім, на жаль, застаецца. Ды яго каманда сёння разам толькі праз наяўнасць сродкаў. На заўтра на праўду можна будзе і забыцца, калі звіецца іншы трэнд пад шыльдай пераменаў у грамадстве і з тымі ж коштамі на распаўсюд улётак, напрыклад.

# Сьцяг — прыкмета пікету апазыцыйнага вылучэнца

Першымі нацыянальную сымболіку пачалі выкарыстоўваць у Віцебску прадстаўнікі ініцыятыўнай групы Віталя Рымашэўскага. Зьбіральнікі подпісаў выходзяць у горад, накінуўшы бел-чырвона-белыя сьцягі на плечы і замацаваўшы іх на грудзёх значыкам з партыйнай сымболікай.

Гэткая ж сымболіка ёсьць і ў афармленьні пікетаў, падкрэсьлівае зьбіральніца подпісаў, віцебская каардынатарка партыі БХД **Тацяна Севярынец:** «На блакітным тле жоўтая бэтлеемская зорка і надпіс „Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя“. Гэта ня проста назва партыі, гэта яшчэ і слоган нашай кампаніі. А сьцяг мы пачалі выкарыстоўваць амаль адразу, і стаўленьне было рознае. Нехта падыходзіў і казаў: „Вось даў бы подпіс, але гэты сьцяг ненавіджу, таму ня дам!“ Тады я адказваю: „А я толькі тады ў вас подпіс вазьму, калі вы будзеце да нашага сьцяга належным чынам ставіцца!“ (сьмяецца). І тлумачу, што гэта наш нацыянальны сымбаль. А бывае і так, што людзі адразу кажуць: слухай, што вы са сьцягам стаіце!»

Нацыянальныя сьцягі на пікетах па зборы подпісаў выкарыстоўваюць ініцыятыўныя групы **Рыгора Кастусёва.** Адзін з такіх пікетаў якраз прайшоў у мінулыя выходныя ў Воршы, распавядае мясцовы актывіст кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Ігар Казьмярчак:

«У мінулыя выходныя на кірмашы побач стаялі зьбіральнікі подпісаў за Міхалевіча, за Кастусёва і за Някляева. Мінакі бачылі тры




пікеты, але падыходзілі адразу да «кастусёўцаў», бы там быў такі вялікі бел-чырвона-белы сьцяг. Адназначна кожны, хто хацеў падпісацца за апазыцыйнага кандыдата, кіраваўся адразу туды, а потым ужо заўважаў: «Ага, дык тут жа можна падпісацца і за кагосьці яшчэ!»

Подпісы за вылучэньне Алеся Міхалевіча таксама зьбіраюць пад бел-чырвона-белым сьцягам. Так было, да прыкладу, у мінулую суботу, калі ў горад прыяжджаў сам патэнцыйны кандыдат.

Адзін са сьцягоў, пад якім зьбіралі подпісы за вылучэньне Міхалевіча, цяпер знаходзіцца ў Першамайскім РАУС — яго адабралі ў віцебскага актывіста **Алеся Галаваня,** які ладзіў пікеты каля Полацкага кірмашу. Нацыянальны сьцяг забралі нібыта на экспэртызу і паабяцалі вярнуць 29 кастрычніка — якраз калі збор подпісаў скончыцца. На думку іншых сябраў ініцыятыўнай групы, сьцяг у Алеся Галаваня забралі невыпадкова — на кірмашы заўжды шмат людзей, і сьцяг адразу прыцягваў увагу да «апазыцыйнага» пікету, тады як побач стаялі пікеты за Аляксандра Лукашэнку.

Дарэчы, у афармленьні гэтых пікетаў заўжды выкарыстоўваецца цяперашняя дзяржаўная сымболіка — сучасны герб і чырвона-зялёны сьцяг.

Сьцяг Эўразьвязу можна штодня ўбачыць у Полацку на пікеце, дзе зьбіраюць подпісы за Андрэя Саньнікава.

У Віцебску яго амаль не выкарыстоўваюць. Гэтаксама ў Полацку пад партыйным сьцягам АГП зьбіралі подпісы за вылучэньне Яраслава Раманчука. Але гэта была прыежджая «група падтрымкі» зь Менску. На Віцебшчыне ў зьбіральнікаў подпісаў за кандыдата ад АГП — толькі пазнавальныя накідкі жоўта-лімоннага колеру.

Па чырвоных або белых накідках пазнаюць і пікеты ў падтрымку Ўладзімера Някляева. Віцебскі каардынатар збору подпісаў **Уладзімер Алексенка** кажа, што выкарыстаньне нацыянальнай сымболікі ініцыятыўная група лічыць неметазгодным:

«Мы ня маем на мэце гаварыць цяпер пра нацыянальную сымболіку, бо гэта ня мае сэнсу. Калі адбудзецца замена рэжыму, тады мы будзем пра гэта гаварыць. Цяпер у нас няма задачы акцэнтаваць увагу на нацыянальнай сымболіцы: наша задача — перамагчы на выбарах».

Але самы, бадай што, незвычайны сымбаль выкарыстоўваюць віцебскія зьбіральнікі подпісаў за Мікалая Статкевіча. Эмблема эўрапейскіх сацыял-дэмакратаў — гэта стылізаваны малюнак ружы, зацiснутай у далоні. Таму зьбірацеь подпісы ўздзельнікі пікету выходзяць зь вялізнай чырвонай штучнай ружай — каля паўтара мэтра вышынёй.

# ІХ УЖО ВОСЕМ

25 кастрычніка кіраўнікі яшчэ трох ініцыятыўных груп патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты Беларусі заявілі, што пераадолелі барʼер у 100 тысяч подпісаў. Да «пяцёркі» тых, хто раней абвесціў пра гэта, дадаліся Алесь Міхалевіч, Мікола Статкевіч і Рыгор Кастусёў. Такім чынам, вызначыліся ўжо 8 прэтэндэнтаў на вышэйшую дзяржаўную пасаду.

Паводле Алеся Міхалевіча, хоць яго група пераадолела неабходны для рэгістрацыі статысячны рубеж, прымаць віншаванні пакуль рана. Ён нагадвае, што яшчэ трэба здаць лісты ў камісіі, дачакацца вынікаў праверак і рэгістрацыі Цэнтравыбаркамам у якасці афіцыйнага кандыдата ў прэзідэнты: «Гэта мне нагадвае кампутарныя гульні з выхадам на наступны ўзровень. Калі на гэтым цябе не забілі, то могуць забіць на наступным. Калі не забілі на наступным, то могуць забіць праз адзін. І гарантавана, што на нейкім узроўні дакладна забʼюць».

Разам з тым спадар Міхалевіч прызнаецца, што адчуванне задаволенасьці ў яго сёньня ёсьць: «Таму што шмат хто ня верыў. Было мноства размоваў, што я гэткую колькасьць подпісаў не зьбяру. Каманда, канечне, верыла. Інакш бы мы 100 тысяч не сабралі. І тое, што мы здолелі выйсці на 100 тысяч, гэта насамрэч дасягненне».

Раней паведамлялася, што больш за 100 тысяч подпісаў было сабрана таксама за Аляксандра Лукашэнку, Уладзімера Някляева, Яраслава Раманчука, Андрэя Саньнікава і Віктара Цярэшчанку.

Збор подпісаў пачаўся 30 верасьня і будзе доўжыцца да 29 кастрычніка ўключна. Ініцыятыўным групам для рэгістрацыі кандыдата ў прэзыдэнты неабходна сабраць не менш як 100 тысяч подпісаў.

**Уладзімер Глод.**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў
**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742
**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна